ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

'91

ЧАЦВЕР
28
САКАВІКА
№ 8(1672)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

Чырвоны радок

З 9 да 19 красавіка ў Варшаве пройдзе выстаўка пад назвай «ВНУ Беларусі прапануюць...» Без Беларускага дзяржаўнага універсітэта ёй, зразумела, не абысціся ні ў якім разе. Ужо створана дэлегацыя БДУ для ўдзелу ў выстаўцы. Падрыхтоўка пачалася!

* * *

Званіце 04, калі, барані, божа, здарыцца нешта з газам у падраздзяленні, дзе вы працуеце. А калі раптам забудзецеся на гэты нумар тэлефона, звяртайцеся да адказнага за газавую гаспадарку БДУ. Назначэнне на гэту пасаду нядаўна атрымала Тэрэза Іванаўна ЯЦКЕВІЧ.

* * *

22—24 сакавіка ва універсітэце прайшла Усесаюзная справаздачна-выбарная канферэнцыя зямляцтва ангольскіх студэнтаў. «Прытулак» пасяджэнням прадаставіў геаграфічны корпус.

Па слядах падзеі

Бывай, марафон! Назаўсёды?

ЗАКЛЮЧНЫ ТУР ТАНЦАВАЛЬНАГА МАРАФОНУ НЕ АДБЫЎСЯ! У пятніцу, 15-га, яго арганізатарам паведамілі з рэктарата, што тэхнічныя прычыны забараняюць правядзенне універсітэцкага вечара. Па тэхнічных прычынах — фармулёўка зручная, што хочаш, то і думай. Студэнты, якія стукаліся 17 сакавіка ў зачыненыя дзверы, пэўна, думалі і адчувалі нешта амаль аднолькавае — крыўду. Адна справа — прыгожа апрануцца і зрабіць прычоску (хто скажа, што гэта проста?), а зусім іншая — настрой. Калі чакаеш вечара з надзеяй, што ён прынясе НЕШТА, але спадзяванні не спраўджваюцца, і застаецца пустэча.

Сапраўды, вялікі горад Мінск падаўся маленькім і цізхім, калі ў ім не знайшлося месца для заключных крокаў універсітэцкага марафону. Рэстаран? Кіно? Тэатр? Гэта ўсё патрабуе планавання. А па-за яго застаецца ўсё той жа тэлеэкран і ўсё тыя ж друкаваныя радкі — ў лепшым выпадку. Застаюцца сустрэчы, якія можна адкласці...

А марафон завяршыўся, хоць і абяцалі ў аб'яве перанесці на іншы дзень яго заключны этап. Нягледзячы на сумныя абставіны фінішу, ён выявіў шчаслівых пераможцаў! Іх віншавалі ў цесным коле арганізатараў і ўдзельнікаў у кафэ «Гаўдэамус». Як жа адкласці апошнія крокі доўгай дыстанцыі? Засталося некалькі метраў да яе заканчэння, і раптам на дарожцы з'яўляецца важная афіцыйная асоба і паведамляе, што фініш спаборніцтваў адбудзецца пазней — невядома дзе, невядома калі...

Няхай выбачаюць важную асобу ўсе, каму не ўдалося яшчэ раз убачыць удзельнікаў марафону і патанцаваць разам з імі. Магчыма, арганізатары паспрабавалі б перанесці ўрачыстую заключную цырымонію, калі б не частка прызоў у выглядзе вялізных тортаў з надпісам «Марафон-91» — яны чакаць не маглі. Торты, як суцяшальная магчымасць «падсаладзіць» паражэнне, дасталіся чатыром парам — першай, трэцяй, пятай і восьмай (шостай на ўзнагароджанні не было). Пары пад нумарам 2 і 4 атрымалі пласцінкі з танцавальнымі мелодыямі — за тое, што ім хапіла вытрымкі дайсці да фіналу. А галоўныя ўзнагароды дасталіся Іне КРАКОТНІК з геафака і Алегу СЕВЯРЫНЧЫКУ, будучаму юрысту. За сваю прыгожую і ўражальную перамогу яны падзялілі 1000рублёў, а таксама прыз глядацкіх сімпатый — аўдыёкасеты. ВІНШУЕМ!

На здымку А. ГУСАКА: Іна і Алег — у трэцім туры марафону, за некалькі хвілін да перамогі.

Наш госць

З такой вось добрай усмешкай наведаў Мінск генеральны консул па знешнепалітычных сувязях кітайскага горада Сіянь ВАН ШУ МІНЬ.

Можа, парадавала яго і знаёмства з мінскім студэнцтвам, што было адной з галоўных мэт візіту?

Консул вёў таксама перагаворы аб ператварэнні Мінска і Сіяня ў гарады-пабратымы. У Беларускім таварыстве дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі ён сустрэўся са старшынёй маладзёжна камісіі таварыства Віктарам Шадурскім, былым сакратаром камітэта камсамола БДУ. Пашчасціла нам на гэты раз на добразычлівасць!

Фота А. ГУСАКА.

Алкаголь — вораг мой

ЧАКАЦЬ ЦУДАЎ?

На працягу аднаго месяца — лютага — факультэт радыёфізікі і электронікі пакінулі адразу пяцёра студэнтаў дзённага аддзялення. Усе яны былі затрыманы ў нецвярозым стане ў «родным» трэцім інтэрнаце. Фармулёўка адлічэння — «за амаральныя паводзіны».

14 лютага сярод ночы сядзелі за бутэлькай (магчыма, не адной) першакурснік Дзмітрый Ціхаміраў, другакурснік Сяргей Сцяпанаў і два выпускнікі гэтага года — Міхаіл Бедуленка і Юрый Пашкевіч. Раптоўны візіт у кампанію прадстаўнікоў Маскоўскага РАУС і вахцёра інтэрната сяброў не напужаў, і хутка рапарт міліцыянераў разам са службовай запіскай дэканата, прысвечаныя інцыдэнту, былі дасланы ў рэктарат. Там было прынята рашэнне развітацца з названымі студэнтамі, не выключаючы і пяцікурснікаў.

Здарэнне, быццам бы, павінна было ўзбударажыць факультэт і адначасова сцішыць аматараў спіртнога, якія жывуць у трэцім інтэрнаце. Але прайшло крыху больш за тыдзень, і нарад міліцыі затрымаў у тым жа інтэрнаце студэнта таго ж факультэта Эдуарда Лішчынца. І тут не было затрымкі за адлічэннем... Эдуард вучыўся на трэцім курсе. І ёсць нейкая злая іронія ў тым, што ў першай «чацвёрцы» адлічаных трэцякурснікаў не было. Прадстаўнікоў чацвёртага курса таксама. Дык можа і з іх хтонебудзь вырашыць папоўніць «няпоўны» спіс?

А вось пра далейшы лёс адлічаных юнакоў можна падумаць ужо без іроніі. Не верыцца, што развітанне з універсітэтам «закадзіруе» іх на астатняе жыццё ад ужывання моцных напіткаў. А раптам?! Сумна, што нам яны аб гэтым не паведамяць, нават калі і адбудзецца цуд...

НАВІНА

ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ СТВОРАНА КАМІСІЯ ПА САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ СЯМЕЙ З ДЗЕЦЬМІ Ў СУВЯЗІ З ПЕРАХОДАМ ДА РЭГУЛЮЕМАЙ РЫНАЧНАЙ ЭКАНОМІКІ. РАШЭННЕ ПРЫНЯТА Ў АДПАВЕДНАСЦІ З ПАСТАНОВАЙ САВЕТА МІНІСТРАЎ СССР, ЯКАЯ ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ТАКУЮ АБАРОНУ. КАМІСІЮ ЎЗНАЧАЛІЎ ПРАРЭКТАР УНІВЕРСІТЭТА ПЁТР ДЗМІТРЫЕВІЧ КУХАРЧЫК, ЯМУ БУДУЦЬ ДАПАМАГАЦЬ ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР, СТАРШЫНІ ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ, НАЧАЛЬНІК АДДЗЕЛА КАДРАЎ І ЮРЫСКОНСУЛЬТ.

Праверка паказала, што...

Спірт без кантролю

Спірт патрэбны? Паспрабуйце звярнуцца на кафедру біяфізікі, у лабараторыю памнажальнай тэхнікі, да... Не, пачакайце. Там жа не так даўно праверка была! Па захаванню і выкарыстанню этылавага спірту. І амаль ва ўсіх падраздзяленнях універсітэта, якія выбрала бухгалтэрыя, каб «пракантраляваць», былі знойдзены сур'ёзныя недахопы і парушэнні: неабсталяваныя месцы захоўвання спірту, не выконваюцца правілы пажарнай бяспекі, адсутнічае сапраўдны кантроль з боку кіраўнікоў, выдача спірту праводзіцца не па меры яго выкарыстання, а паквартальна.,.

Па сумных выніках праверкі ў БДУ створана камісія, якая будзе займацца штоквартальнай інвентарызацыяй спірту. Яе ўзначаліў старшыня А. П. ГРЫШАНОВІЧ, намеснік прарэктара па навуковадаследчай рабоце. Прынята рашэнне аб тым, каб накладаць адміністратыўныя спагнанні на парушальнікаў інструкцый па захаванню спірту, а віноўнікаў недахопу ці псавання каштоўнага рэчыва прымушаць вяртаць яго поўны кошт.

Сведчаць сацыёлагі

СКАЖЫЦЕ, ВЫКЛАДЧЫК...

Звычайна знакамітыя людзі прысвячаюць свае ўспаміны школьным настаўнікам або навуковым кіраўнікам. А «сярэдняе звяно» — універсітэцкі (інстытуцкі) выкладчык — застаецца часцей па-за ўвагай мемуараў. Дзвюх прычын наўрад ці хопіць для тлумачэння гэтай з'явы. Тут да месца трывалыя апытанні і даследаванні...

Сацыёлагі БДУ лічаць гэту праблему сур'ёзнай і вартай вывучэння. У анкетах, якія яны рыхтуюць, звычайна знаходзіцца месца для пытанняў, што закранаюць узаемаадносіны студэнтаў і выкладчыкаў.

Паводле аднаго з апошніх апытанняў, поўнае задавальненне ад гэтых зносін адчуваюць 16,2 працэнта студэнтаў БДУ, якія прынялі ўдзел у анкетаванні. 64,1 працэнта паведамілі пра сваю задаволенасць толькі адносінамі з асобнымі выкладчыкамі. А 10,8 працэнта апытаных наогул не маюць такога пачуцця, хоць выказаліся аб гэтым няўпэўнена: «мабыць, не...»

Колькасць цалкам незадаволеных невялікая — 5,3 працэнта, і гэта магло б абнадзейваць, калі не звяртацца да раздзелу анкеты, прысвечанаму крыніцам інфармацыі, якімі карыстаюцца студэнты. У гэтым шэрагу размовы з выкладчыкамі набралі толькі 10,7 працэнта і не вытрымалі канкурэнцыі з прэсай (61,2), тэлебачаннем (57,8) і, што найбольш паказальна, зносінамі з іншымі студэнтамі (яны з'яўляюцца асноўнай інфармацыйнай крыніцай для 32 працэнтаў апытаных).

Можна паспрабаваць адшукаць адказы на захаваныя ў сацыялагічных лічбах незразумеласці з дапамогай іншых вынікаў даследавання. Найбольш студэнтаў (64,7 працэнта) якія прынялі ў ім удзел, аддаюць перавагу свабодным гутаркам з выкладчыкамі ў неафіцыйных абставінах. З вялікім адрывам ад гэтай формы зносін ідуць дыскусіі на вольныя тэмы (іх аматары — 16,8 працэнта ад агульнай колькасці апытаных). І зусім аддалена канкуруюць сустрэчы ў клубах па інтарэсах, навуковыя дыскусіі і вечары пытанняў-адказаў.

Які ж вывад рабіць таму выкладчыку, для каго паўнацэнныя адносіны з вучнямі не апошняя справа? Часцей выклікаць іх на размовы сам-насам? Пэўна, не зусім дастойны гэта занятак для дацэнтаў і прафесараў. Яны, хутчэй за ўсё, чакаюць ініцыятывы з боку студэнтаў. А тыя, у сваю чаргу, скардзяцца на рэдкія кантакты з выкладчыкамі: у невучэбны час амаль адсутнічаюць такія ў 40,7 працэнта апытаных студэнтаў БДУ, вельмі рэдкія — у 33,4, маюць магчымасць пагутарыць з выкладчыкамі пасля заняткаў некалькі разоў у месяц 12,5 працэнта, а некалькі разоў на тыдзень — 6,1. А вось 5,9 працэнта тых, хто запоўніў анкету, не маюць такіх зносін і не мараць пра гэта. Фармулёўка менавіта такая, амаль абразлівая: «не, і няма жадання».

Тут ужо патрабуецца адказ выкладчыкаў. Але такой магчымасці яны не мелі — сярод іх сацыялагічныя анкеты з нагоды адносін са студэнтамі пакуль не распаўсюджваліся. Цікава, якія б вынікі атрымаліся?

Пасля Чарнобылю

ХОДЗІЦЬ ВУЧОНЫ З ІДЭЯЙ

Уладзімір Альгердавіч паставіў перада мной ёмістасці. Кожная з іх на дзве трэці была запоўнена нечым накшталт драблёных каменьчыкаў. Падумалася: вось яно, чарадзейнае рэчыва, якое можа хоць крыху абараніць нас ад радыяцыйнай бяспекі. І дзяцей нашых, і ўнукаў. Шанцуе ж людзям — тым, хто дадумаўся да такога.

Я ўважліва сачыла за тварам вучонага і спадзявалася ўбачыць на ім гонар за сябе і за сваіх калег. Магчыма нават высакамернасць: вось, маўляў, якія мы. Аднак акрамя стомленасці і адчаю цяжка было штосьці заўважыць на ім.

Старшы навуковы супрацоўнік НДІ фізіка-хімічных праблем У. А. Шаблоўскі і яго паплечнікі сапраўды стаміліся. Не ад работы. Яна не забірае ў чалавека столькі сіл, як барацьба з бюракратызмам, тугадумствам і абыякавасцю.

З сярэдзіны 60-х гадоў вучоныя універсітэта займаюцца распрацоўкай і вывучэннем фізіка-хімічных уласцівасцей неарганічных сарбентаў. Праўда, падобная работа вялася і раней, аднак увагу вучоных прыцягвалі ў большай ступені арганічныя іёнаабменныя смолы. Ішоў час, праводзіліся ўсё новыя і новыя доследы. Хімікам не падабалася іх «усёяднасць», якая перашкаджала вырашаць некаторыя народнагаспадарчыя пытанні, у прыватнасці, у радыехіміі. Арганічныя смолы, на жаль, не селектыўныя і паглынаюць усе катыёны. З дапамогай іх цяжка вылучыць з раствору які-небудзь элемент, не кранаючы іншых.

Тады і вырашылі вучоныя ўзяцца за неарганічныя сарбенты.

Сёння, пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, тэма гэта надзвычай актуальная — ачыстка вадкіх рэчываў: малака, вады, сокаў — ад радыёактыўных цэзія і стронцыя. Так думалі да пары да часу і супрацоўнікі лабараторыі высокатэмпературных рэакцый НДІ ФХП. Асабліва адразу пасля выбуху, калі іх выспешвалі — ці хутка будуць канкрэтныя вынікі даследаванняў.

Доўга чакаць не давялося. Яшчэ за чатыры гады да таго трагічнага дня восемдзесят шостага У. А. Шаблоўскі абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную распрацоўцы сарбентаў, якія б дазвалялі выводзіць радыеактыўны цэзій і стронцый непасрэдна з першага контура атамных станцый.

Такім чынам, задзел быў, і немалы. А потым рэзультат — таксама значны. Вучоныя не проста далі сарбент. Дзякуючы іх распрацоўцы на Гомельскім малочным камбінаце быў спраектаваны і пабудаваны спецыяльны цэх, які, згодна з праектнай магутнасцю, мог бы перапрацоўваць да 500 тон малака ў дзень. Гэта значыць, штодня людзі атрымлівалі б чыстага малака на 500 тон больш.

Толькі нядоўга радаваліся хімікі. Знайшліся людзі, якія ці то палічылі, што такі цэх непатрэбны наогул (яго як замарозілі, у такім стане ён знаходзіцца і сёння), ці то засумняваліся ў каштоўнасці вынаходніцтва. Інакш з якой нагоды адзін з кіраўнікоў Дзяржкамітэта БССР па праблемах вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай станцыі цікавіўся ў час паездкі ў ЗША ўстаноўкай па ачыстцы малака ад радыёнуклідаў? Дарэчы, каб купіць такую «тэхніку», патрэбны немалыя сродкі — 200 тысяч долараў на выпрабаванні і па 100 тысяч за кожны агрэгат. А на будаўніцтва і абсталяванне цэха ў Гомелі дастаткова было ўсяго 660 тысяч «драўляных» савецкіх рублёў.

Гэта рашэнне наконт кансервацыі цэха літаральна ашаламіла супрацоўнікаў інстытута. Яно і сёння застаецца для іх загадкай. Менавіта з таго дня пачаліся іх хаджэнні па пакутах. Кабінет за кабінетам, інстанцыя за інстанцыяй... А вынік — павялічвалася кола знаёмстваў у вышэйшых эшалонах улады і змяншалася жаданне пераконваць, даказваць, сцвярджаць. Нарэшце яно зусім знікла. Як і ахвота мець справу з дзяржаўнымі прадпрыемствамі і ўстановамі. Вучоныя вырашылі проста працаваць і не браць пад увагу дробязі. А з'явіцца штосьці цікавае — прапанаваць ідэю для рэалізацыі ў прыватныя фірмы.

Напрыклад, такую. На аснове неарганічных сарбентаў, знойдзеных Уладзімірам Альгердавічам і яго калегамі, з'явілася магчымасць распрацаваць установкі для ачысткі малака. Пры пяцікратным прапусканні яго цераз такую калонку, запоўненую сарбентам, можна амаль цалкам пазбавіцца ад радыеактыўных рэчываў. Механізм дзеяння даволі просты. Так званыя сарбенты — порыстыя структуры. Іёны цяжкіх металаў, праходзячы цераз гэтыя матэрыялы, трапляюць у гранулы і абменьваюцца з іёнамі, напрыклад, натрыя. Пры гэтым іх тлушчавыя, бялковыя і вугляводныя ўласцівасці не мяняюцца.

Група «Шаблоўскі і К^0» і прапануе наладзіць выпуск такіх установак. Яны простыя, эфектыўныя, а галоўнае — недарагія. Да таго ж, іх можна выкарыстоўваць не толькі ў забруджаных зонах — нядрэнна было б ачышчаць і пітную ваду для мінчан, якая ўтрымлівае вялікую колькасць цяжкіх металаў — медзі, цынку, свінца, кадмію і інш. І зноў, як кажуць, лезу я наперад — асадзі назад. Дзяржава не спяшаецца ўхапіцца за ідэю і паставіць выпуск такой «тэхнікі» на шырокую нагу. Відаць, нядрэнна было б забяспечыць ёю сялян, якія трымаюць кароў і здаюць малако дзяржаве (мала дзе ў рэспубліцы атрымліваецца яно чыстым), а таксама тых, хто жыве на забруджанай радыёнуклідамі тэрыторыі. Але каб зрабіць гэта, патрэбна вырашыць шмат спадарожных праблем: з выпускам установак, іх дастаўкай, заменай адпрацаваных фільтраў, якія неабходна дзесьці хараніць. Дзяржаве, відаць, не пад сілу такія цяжкасці. Уладзімір Альгердавіч спадзяецца, што яму дапамогуць кааператывы і малыя прадпрыемствы. Тоесёе ўжо атрымліваецца.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

Чыталі?

Заходнія кампаніі стаміліся ад катаклізмаў у Савецкім Саюзе

Гарбачоў не можа сабе дазволіць адпіхнуць замежных укладчыкаў. Без іх яго надзеі на адраджэнне савецкай эканомікі, якая перажывае зараз крызіс, ніколі не збудуцца. Аднак зараз, калі заходнія замарожваюць крэдыты Саветам у знак пратэсту супраць жорсткай пазіцыі Гарбачова, новых пагадненняў становіцца ўсё менш.

Недахоп фінансавання негатыўна адлюстроўваецца на ўжо рэалізуемых здзелках. Англійскі дэпартамент гарантый экспартных крэдытаў, які ўжо забяспечыў савецкія пагадненні прыкладна на 4 млрд. долараў, сцвярджае, што пытанне аб далейшай фінансавай падтрымцы зараз «разглядаецца». Аднак кіраўнікі англійскіх кампаній гавораць, што дэпартамент адмаўляецца ад якога б ні было новага фінансавання. «Гэта з'яўляецца сур'ёзнай пагрозай для гандлю з Савецкім Саюзам»,— гавораць упраўляючы кампаніяй па перапрацоўцы прадуктаў харчавання «АПВ бейкер лімітэд» Лоры Кэнан. З яго слоў, з планамі продажу Расійскай рэспублікі абсталявання па перапрацоўцы прадуктаў харчавання прыкладна на 40 мільёнаў долараў зараз прыдзецца пачакаць. Белы дом, магчыма, прыме яшчэ больш жорсткія меры.

Адварочваючыся ад Савецкага Саюза, Захад толькі паскарае хуткі ўпадак савецкай эканомікі. Саветы, з іх вялікімі пазыкамі і недахопам цвёрдай валюты, маюць патрэбу ў замежнай тэхналогіі, фінансаванні і спажывецкіх таварах. Апошняя змрочная прыкмета ўпадку праявілася ў канцы студзеня, калі стала вядома, што дабыча нафты, галоўнай крыніцы цвёрдай валюты для Масквы, скарацілася ў 1991 годзе на 7 працэнтаў, дасягнуўшы самага нізкага за 12 гадоў узроўню. Больш таго, высокапастаўленыя прадстаўнікі нафтавай прамысловасці папярэджваюць Гарбачова, што гэта краіна, якая з'яўляецца сёння буйнейшым у свеце вытворцам нафты, можа стаць у 1993 годзе яе імпарцёрам.

У гэтай блытаніне заходнія ўкладчыкі ўжо не ведаюць дакладна, хто кантралюе сітуацыю. У той час як Саветы аб'явілі аб сваім першым аўкцыёне ліцэнзій на здабычу нафты і газу на тэрыторыях каля Каспійскага мора, некаторыя работнікі нафтавай прамысловасці запатрабавалі даць ім права распараджацца здабытай імі нафтай. «Мы хочам сапраўднай незалежнасці»,— гаворыць старшыня цюменскага рэгіянальнага прафсаюза работнікаў нафтавай і газавай прамысловасці Мікалай Трыфанаў. Гэты хаос пагаршаецца міжусобіцай цэнтральных улад і непакораных рэспублік.

Напрыклад, Саветы нядаўна анулявалі план французскай кампаніі «Пешынэ» адносна будаўніцтва ў Арменіі завода па вытворчасці ўпаковачных матэрыялаў на 200 мільёнаў долараў. Адзін з кіраўнікоў гэтай кампаніі гаворыць: «Маскоўскія бюракраты адкрыта сказалі нам, што не хочуць буйных капіталаўкладанняў у рэспубліцы, якая праз пяць гадоў можа перастаць быць часткай Савецкага Саюза».

Многія бізнесмены сцвярджаюць, што Гарбачоў не можа працягваць рэформу, пакуль не адновіць парадак у эканоміцы, якая разваль-ваецца. «Калі не будзе падтрымлівацца хоць якая-небудзь стабільнасць, няма ніякай надзеі на рэальныя (эканамічныя) перамены»,— гаворыць Джэймс Гіффэн, прэзідэнт Амерыканскага гандлёвага кансорцыума, аб'яднання ўкладчыкаў высокага класа ў Савецкім Саюзе, які ўключае ў сябе кампаніі «Шэрон», «Джонсан энд Джонсан» і «Істмэн кодак».

Аднак пакуль што ўсё больш кампаній адмаўляюцца ад супрацоўніцтва. Не так даўно японскія кампаніі аказалі халодны прыём савецкай гандлёвай дэлегацыі, якая дабілася капіталаўкладанняў у трынаццаць буйных праектаў, у асноўным звязаных з прыроднымі рэсурсамі. Еўрапейскія кампаніі таксама стаміліся ад эканамічных катаклізмаў у Савецкім Саюзе. Напрыклад, кампанія «Брыціш эйруэйз» адчувае цяжкасці са стварэннем сумеснага прадпрыемства з савецкай авіякампаніяй Аэрафлот з мэтай фарміравання новай расійскай авіякампаніі. Гэта праблема ўключае ў сябе перастаноўкі ў вышэйшым кіраўніцтве Аэрафлоту і цяжкасці з фінансаваннем, якое павінна скласці 700 мільёнаў долараў.

Заходнія вытворцы спажывецкіх тавараў настроены яшчэ больш песімістычна. Кампанія «Пежо» і «Даймлер-Бенц» замаразілі планы вытворчасці ў Савецкім Саюзе легкавых аўтамабіляў для ўнутранага спажывання. Іншыя кампаніі, ашаломленыя падзеямі ў Прыбалтыцы, адмовіліся ад новых праектаў. «Я бачу, як уладу бяруць у свае рукі армія і КДБ, — гаворыць Жан-П'ер Жанс, загадчык аддзела міжнародных сувязей французскай кампаніі па вытворчасці адзення «Дэванле», якая адмовілася ад спроб вытворчасці ў Расійскай рэспубліцы тавараў для дзяцей.— Вы не можаце сказаць мне пра Савецкі Саюз нічога добрага».

Аднак некаторыя кампаніі, занятыя ў праектах, якія падтрымліваюцца цэнтральнымі ўладамі, працягваюць сваю дзейнасць. Занепакоеныя тым, што ніхто не пойдзе на значныя капіталаўкладанні ў краіне з састарэлай сістэмай сувязі, Саветы вядуць перагаворы з кампаніямі «Алькатэль», «Сіменс» і шэрагам аддзяленняў кампаніі «Белл» аб мадэрнізацыі міжнароднай і дальняй тэлефоннай сувязі. Што датычыць мясцовай тэлефоннай сувязі, Масква пачала ажыццяўленне планаў перадачы рэспублікам усёй адказнасці за кантракты з замежнымі сумеснымі прадпрыемствамі на закуп абсталявання.

«БИЗНЕС УИК» (ЗША).

Па сакрэту універсітэту

«Сувеніраў у мяне дастаткова...»

Некалькі тыдняў у нашым горадзе знаходзілася карэспандэнтка Свабоднага берлінскага радыё Катарына ГІБЕЛЬ. У дзень ад'езду яна дала кароткае інтэрв'ю аб сваім знаходжанні ў Беларусі.

— Катарына, раскажы крыху пра сябе.

— Мне 22 гады. Заканчваю свабодны універсітэт па спецыяльнасці палітыка і славістыка. З нядаўняга часу працую карэспандэнтам аддзела культуры берлінскага радыё. Па запрашэнню савецкага боку прыехала на Беларусь.

— І якія першыя ўражанні аб нашай краіне?

— Шчыра кажучы, думала, што тут становішча намнога лепшае. На жаль, крыху расчаравалася. Перад паездкай у ФРГ абмяняла маркі на савецкія рублі, мяркуючы расходаваць іх тут. Аказалася, што гэта няпростая задача. Нават з сувенірамі праблема. Толькі я не адчайваюся: сувеніраў у мяне дастаткова ў выглядзе пяці- і дзесяцірублёвых купюр.

— Калі ты ехала сюды, відаць, ужо ведала, якія будзеш рабіць рэпартажы?

— У першую чаргу, зразумела, пра моладзь. На мой погляд, цікавае інтэрв'ю павінна атрымацца са студэнтамі універсітэта і інстытута культуры. Яно спадабаецца нямецкаму слухачу. Мяне вельмі цікавіла таксама праблема экалогіі. Але, на жаль, ваша кіраўніцтва надзвычай занятае, і ніхто не знайшоў для мяне крышачку вольнага часу, каб даць інфармацыю.

— Што ты думаеш пра нашу знешнюю палітыку?

— Асабіста ў мяне выклікае глыбокае задавальненне наступальны характар савецкай знешняй палітыкі ў барацьбе за мір, сур'ёзны падыход да праблем раззбраення. Па-мойму, шлях да мірнай Еўропы ўжо не ілюзія, а рэальнасць.

— Катарына, ці хацела б ты, напрыклад, каб нашы гарады сталі пабрацімамі?

— Бясспрэчна. Берлін валодае магутнай тэхнічнай базай, перадавым ноу-хау. Новае кіраўніцтва горада мяркуе задзейнічаць патэнцыял, які маецца ў Берліне, для супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам. Гэта ў інтарэсах абедзвюх дзяржаў. Ужо зараз паміж Свабодным берлінскім універсітэтам і АН СССР ідуць перагаворы аб сумеснай рабоце па барацьбе супраць СНІДа.

— Пабываўшы ў нашай краіне, ты ўвачавідкі змагла назіраць тыя змены, што адбываюцца ў нас апошнім часам. У цябе, напэўна, склаліся нейкія адносіны да іх?

— Некалькі гадоў назад яны былі станоўчымі. Зараз многія мае суайчыннікі не могуць зразумець, што ваш урад хоча зрабіць? Бясспрэчна адно: ці ён канчаткова разваліць краіну, ці выведзе яе з крызісу. Змяніліся на Захадзе і адносіны да Ельцына. Апошнім часам яны значна лепшыя, чым да Горбі — так мы называем Гарбачова.

— Ці цікавішся ты вялікай палітыкай?

— Я лічу памылковым дзяленне палітыкі на вялікую і малую. Яна бывае або добрай, або дрэннай. Так, я цікаўлюся палітыкай. Раней падтрымлівала камуністаў, а зараз — «зялёных» і сацыял-дэмакратаў.

У канцы гутаркі мы пацiснулі на развітанне рукі і распачалі жартаўлівую спрэчку аб тым, як павінны звяртацца адзін да аднаго камуністы і сацыял-дэмакраты — гаспадзін ці таварыш?

Між іншым, сёння гэта пытанне ўжо зусім не жартоўнае...

А. ГУСАК.
Фота АЎТАРА.

Я там быў...

...ЯК У СВЕЦКІМ ЖЫЦЦІ

Па запрашэнню газеты «Московский Церковный Вестник» — органа Маскоўскай Патрыярхіі, я быў запрошаны ў рэдакцыю для азнаямлення з яе работай, да нядаўняга часу пра якую мала што было вядома.

Па некалькіх будынках, якія стаялі практычна прыціснуўшыся адзін да аднаго, ніяк нельга было здагадацца, што тут размяшчаецца цэнтр выдавецкай дзейнасці Рускай праваслаўнай царквы. Хутчэй мноства машын замежных марак наводзілі на думку аб нейкім замежным прадстаўніцтве ці пасольстве. І толькі маляўніча распісаныя абразы над уваходам у будынак сведчылі аб наяўнасці тут духавенства.

Пятнаццаць-дваццаць хвілін мне хапіла, каб абысці ўсе аб'екты і вярнуцца на ранейшае месца. Усё, як у свецкім жыцці.

...Разам з загадчыкам аддзела царкоўнага жыцця Міхаілам ДУДКО падняліся па каменных прыступках на трэці паверх, дзе размяшчаецца рэдакцыя газеты. Атмасфера, якая панавала ў кабінетах, нічым не адрознівалася ад звычайных рэдакцый. Адзінае, чаму можна пазайздросціць,— мэбля. Затое горш з тэлефоннай сувяззю — адзін тэлефон на ўсю рэдакцыю.

У штат «Весніка» ўваходзіць восем чалавек, акрамя ўласных карэспандэнтаў. Для ажыццяўлення абмену вопытам падтрымліваюцца кантакты з многімі рэлігійнымі выданнямі ў іншых краінах.

Пакуль праглядваў падшыўкі газеты, гаспадары прыгатавалі каву. Слова за слова — і пайшла гутарка. А потым мы невялікай групай рушылі ў цэнтральны будынак — «мармуровы храм», як называюць сталовую, дзе на сценах таксама абразы і карціны на рэлігійную тэматыку. Той, хто ўваходзіць у сталовую, абавязкова павінен перахрысціцца. На выхадзе таксама. Паставіўшы ежу на стол, яе абавязкова патрэбна перахрысціць. Такі парадак.

У сувязі з Вялікім пастом ежа да Пасхі толькі раслінная, без мяса. На першае — суп з гародніны. На другое — пшонная каша, на трэцяе — кампот з садавіны. Зазначу: усе выдаткі на харчаванне бярэ на сябе царква.

Пасля абеду ўсе займаюцца сваімі справамі. У каго камандзіроўка ў манастыр, у каго — у царкву, хто проста размаўляе з наведвальнікамі. Для зручнасці ў рабоце ў будынку знаходзіцца вялікая бібліятэка, дзе ёсць кнігі па рознай тэматыцы: ад хрысціянства да атэізму.

Знаёмства з кнігамі завяршыла візіт у рэдакцыю «Московского Церковного Вестника».

А. ГУСАК.
Фота аўтара.

Якраз для вас

Паважаны сябар!

Працягваем друкаваць анкету аддзела сацыялагічных даследаванняў Дзяржаўнай кніжнай палаты БССР з мэтай вывучэння папулярнасці беларускай мастацкай кнігі, выдадзенай у рэспубліцы.

Запрашаем вас адзначыць тыя кнігі, якія вы прачыталі. Насупраць назваў твораў абвядзіце кружочкам лічбу, адпаведную вашаму меркаванню: 1 — прачытаў з вялікай цікавасцю; 2 — спадабалася; 3 — не ўразіла.

ПРОЗА

82. Говар В. Пялёстак і крышталь. Раман 1 2 3
83. Грахоўскі С. Споведзь. Аповесці і вершы 1 2 3
84. Дайнеко Л. Меч князя Вячки. Тропой Чародея: Романы 1 2 3
85. Дамашэвіч У. Камень з гары. Раман 1 2 3
86. Ждан О. Самостоятельная жизнь. Повести о необычных и обычных людях 1 2 3
87. Зарэцкі М. Збор твораў. У 4-х т. Т. 2. Голы звер: Аповесць. Сцежкі-дарожкі. Раман 1 2 3
88. Земляробчы каляндар. Абрады і звычаі. Сер. «Беларуская народная творчасць». 1 2 3
89. Зона бяды: Пісьменнікі, вучоныя, публіцысты пра экалогію.
90. Кабржыцкая Т., Рагойша В. Слядамі знічкі. Пра Сяргея Палуяна. Нарысы. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
91. Кажадуб А. Дарога на замчышча. Аповесці. 1 2 3
92. Казлоў А. Міражы ценяў. Апавяданні. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
93. Казько В. Выбр. творы. У 2-х т. Т. 1. Неруш: Раман, Апавяданні 1 2 3
94. Казько В. Т. 2. Хроніка дзетдомаўскага саду: Раман, Цвіце на Палессі груша: Аповесць 1 2 3
95. Караткевіч У. Збор твораў. У 8-мі т. Т. 6. Хрыстос прызямліўся ў Гародні: (Евангелле ад Іуды) Раман 1 2 3
96. Караткевіч У. Т. 7. Дзікае паляванне караля Стаха: Аповесць, Чорны замак Альшанскі: Раман 1 2 3
97. Караткевіч У. Т. 8. Кн. 1. П'есы, Нарысы. 1 2 3
98. Кацюшэнка М. Прызнанне левага крайняга: Раман, Аповесць 1 2 3
99. Конев Ф. Снегопад. Повести 1 2 3
100. Крываль С. Аднойчы летам. Апавяданні 1 2 3
101. Кудрявцев А. Бессонница: Рассказы, повести 1 2 3
102. Ласкоў І. На падводных крылах. Аповесці 1 2 3
103. Ліпскі У. Невядомы: Аповесць пра Ігната Грынявіцкага 1 2 3
104. Лойка А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае. Раман-эсэ 1 2 3
105. Макаёнак А. Збор твораў. У 5-ці т. Т. 5. Гумарэскі, фельетоны, артыкулы, інтэрв'ю, дзённікі, нататкі, пісьмы 1 2 3
106. Мартинович А. Травинка и камень. Повести 1 2 3
107. Марчук Г. Вочы і сон. Сава Дым і яго палюбоўніцы: Раманы 1 2 3
108. Місько П. Хлопцы, чые вы будзеце... Раман у 2-х кн. 1 2 3
109. Мыслівец В. Выгнанне грэшнікаў. Дакум. аповесць 1 2 3
110. Навуменка І. Апрасцімся, сябры... Апавяданні. Б-ка «Вожык» 1 2 3
111. Падбярэзскі Д. Уверцюра: Апавяданні і аповесць 1 2 3
112. Пад знакам Стральца. Апавяданні. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
113. Палітыка П. Праверка. Сатырычныя апавяданні 1 2 3
114. Пантюшенко Т. Главный врач. Роман 1 2 3
115. Перад маімі вачыма. Апавяданні. Б-ка «Маладосць» 1 2 3
116. Попов Т. За тридевять планет. Повесть 1 2 3
117. Прокша Л. Урокі любові і нянавісці. Раман 1 2 3
118. Пташнікаў І. Збор твораў. У 4-х т. Т. 1. Чакай у далёкіх Грынях: Раман, апавяданні 1 2 3
119. Пташнікаў І. Т. 2. Тартак, Найдорф: Аповесці, апавяданні 1 2 3
120. Пучинский Ю. Смоленское шоссе. Рассказы 1 2 3
121. Ранішняя дарога. Творы маладых аўтараў 1 2 3
122. Рубанаў У. Светлы ручай любові. Аповесці 1 2 3
123. Саламаха У. Цяпло чужога сэрца. Аповесці, апавяданні 1 2 3
124. Сердюков В. На излёте лояльности. Публицистика 1 2 3
125. Сіпакоў Я. Журба ў стылі рэтра. Кніга прозы 1 2 3
126. Скрыган Ян. Некалькі хвілін чужога жыцця: Апавяданні, успаміны, роздум 1 2 3
127. Сульянов А. Голубые снега. Роман 1 2 3
128. Сцяпан У. Вежа. Апавяданні 1 2 3
129. Тарас В. День времени. Избранные повести и рассказы 1 2 3
130. Ткачоў П. Час світальнай зоркі. Аповесці 1 2 3
131. Федарэнка А. Гісторыя хваробы: Аповесць, апавяданні 1 2 3
132. Чорны К. Збор твораў. У 6-ці т. Т. 5. Сумліцкая хроніка, Смага: Аповесці, апавяданні, публіцыстыка 1941—1944 1 2 3
133. Цвяткоў У. Усё наадварот. Гумарэскі. Б-ка «Вожык».
134. Шамякін І. Драма: Аповесці, гістарычныя сцэны 1 2 3
135. Шахавец У. Дарога пачыналася ў Бярозаўцы. Аповесці. 1 2 3
136. Якубовіч У. Клапатлівы шэф. Апавяданні, гумарэскі. Б-ка «Вожык» 1 2 3

Тэст

Ці ўмееце вы праводзіць вольны час?

У кожнага бываюць такія хвіліны, калі ўсё здаецца марудным, няма куды сябе дзець, і час цягнецца бясконца доўга. У адных людзей гэта адбываецца больш часта, у другіх радзей. А ёсць такая катэгорыя людзей, якім сумна не бывае ніколі. Яны заўсёды знойдуць, як выкарыстаць вольны час.

Паспрабуйце адказаць на наступныя пытанні і вырашыць, ці здольны вы не губляць час дарма.

1. Ці здаецца вам летні адпачынак кароткім?
2. Ці бывае так, што вам няма чым сябе заняць?
3. Ці спыняеце вы часам гульню з таварышам з-за таго, што яна стала сумнай для вас?
4. Калі вы з сябрамі, ініцыятар усіх гульняў — вы?
5. Ці ведаеце вы хаця б чатыры разнавіднасці настольных гульняў?
6. Ці любіце вы проста бадзяцца без мэты?
7. Вы любіце чытаць?
8. Вы калекцыяніруеце што-небудзь?
9. Ці вядзеце вы дзённік?
10. Ці любіце рашаць красворды?
11. Ці лічыце вы дождж у выхадныя дні катастрофай?
12. Калі вы чакаеце каго-небудзь ці чаго-небудзь, ці ўмееце заняць сябе, каб не нервавацца?

Адно ачко вы атрымаеце за адказ «так» на пытанні 1, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10, 12 і столькі ж за адмоўны адказ на пытанні 2, 3, 11.

А цяпер падлічыце.

Калі ў вас больш чым 8 ачкоў, вы ўмееце праводзіць вольны час. Вашы сябры ніколі не сумуюць з вамі, ды й для вас смутак не занятак. Такой якасці можна толькі пазайздросціць.

Ад 4 да 8 ачкоў: у вас, як у большасці людзей, бываюць дрэнныя дні, калі нічога не атрымліваецца, нічога не радуе. Вы ведаеце, што нядрэнна мець на запас нейкае захапленне, якое ў любым становішчы дапаможа хоць крышачку палепшыць ваш настрой.

Менш чым 4 ачкі: калі вы шчыра адказалі на пытанні і вас сапраўды нічога не цікавіць — паспрабуйце паназіраць за тымі, хто ўвесь час чымсьці заняты, і, магчыма, вы навучыцеся берагчы свой час.

Сакрэт фірмы

Даеш усеагульную флюараграфізацыю!

Спачатку — флюараграфія, потым здача кніг у бібліятэку і толькі тады — экзамены. Такі парадак допуску да заліковай сесіі ўстанавіў рэктарат Карагандзінскага універсітэта. Студэнт ужо да ўсяго прывык і не будзе здзіўляцца, калі ў наступны раз не «выйдзе» на сесію з-за таго, што не заплаціў камсамольскія ўзносы ці носіць «нестатутную» прычоску.

Студэнтам — дзешавей

Як і многія студэнцкія «шматтыражкі», газета Башкірскага універсітэта «Кафедра» зараз не будзе бясплатна раздавацца ўсім жадаючым. Цэны на паперу катастрафічна ўзраслі, а датацый няма. Таму рэдакцыя вырашыла выходзіць з цяжкага становішча з дапамогай чытачоў. За межамі студгарадка газета будзе каштаваць 25 капеек, але супрацоўнікам і выкладчыкам універсітэта яе прапануюць за 15, а студэнтам яшчэ танней — за 10 капеек.

Падайце былому прафесару

Прафсаюзны камітэт Кіеўскага універсітэта стварыў фонд дапамогі скарочаным супрацоўнікам і абзавёўся адпаведным рахункам у банку. Пасільны ўзнос — 800 рублёў — ужо зрабіў камітэт камсамола ВНУ. Не дарма гаворыцца: гнаны ды зразумее гнанага.

Якіх жа мэт спадзяюцца дасягнуць аўтары гэтай фінансавай ініцыятывы? Па іх прагнозах, перамены ў вышэйшай школе патрабуюць вялікіх ахвяр. Зусім магчыма, што з'явяцца беспрацоўныя дацэнты і прафесары. Ім якраз і павінен дапамагаць фонд, выплочваючы своеасаблівую дапамогу ў перыяд пошуку новага месца работы.

1. На якой мове Вы аддаеце перавагу чытанню кніг беларускіх пісьменнікаў?
1. на беларускай 1
2. на рускай 2
3. усё роўна 3

2. Ці адчуваеце Вы змены ў выданні нацыянальнай літаратуры ў рэспубліцы?
Калі «так», то якія? . . . . . .
. . . . . .

Калі «не», то што Вы можаце прапанаваць дзеля ўдасканальвання кнігавыдавецкай справы ў гэтым напрамку
. . . . . .

А цяпер некалькі пытанняў пра Вас
(Абвядзіце кружочкам лічбу насупраць Вашага адказу)

3. Ваш узрост . . . . . .
4. Ваша нацыянальнасць . . . . . .
5. Ваш пол . . . .
Мужчынскі 1
жаночы 2
6. Ваша адукацыя
сярэдняя 1
сярэдне-спецыяльная 2
вышэйшая 3
7. Да якой сацыяльнай групы Вы належыце?
рабочы (прамысловасці) 1
калгаснік, рабочы саўгаса 2
навучэнец (школы, ПТВ) 3
студэнт (ВНУ, тэхнікума) 4
служачы 5
пенсіянер 6
8. Дзе Вы пражываеце?
у сталіцы рэспублікі 1
у іншым горадзе 2
у сельскай мясцовасці 3

Калі Вы не супраць таго, каб мы мелі магчымасць супрацоўнічаць з Вамі далей, шчыра просім Вас паведаміць:
Ваша імя і прозвішча . . . .
Ваш адрас (тэлефон) . . . . . .
Дзякуем за ўдзел у анкетаванні!
Запоўненыя анкеты накіроўвайце на адрас:
220600. г. Мінск, пр. Машэрава, 11. Дзяржаўная кніжная палата БССР. Аддзел сацыялогіі.

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

ЗА РАЗМОВЫ Ў «МАСТАЦКАЙ ГАСЦІНАЙ» АДКАЗВАЛА Вераніка БЯГУН.

Прывітанне!

Старое новае выданне

«Советский экран» ператварыўся ў «Экран». Знікла з вопраткі часопіса адно слова. А за гэтым? Тое, што засталося ад назвы, «гасцюе» цяпер ва ўсіх кіёсках «Саюздруку». Добры час надышоў для прыхільнікаў часопіса, якія на працягу ўсёй 65-гадовай гісторыі яго выдання ганяліся навыперадкі адзін з адным, каб паспець схапіць адзінкавыя экземпляры «СЭ». Сённяшні кошт часопіса ў паўтары рублі не «кусае» толькі самых заўзятых яго аматараў.

У першым нумары 1991 года адноўлены «Экран» надрукаваў лісты сваіх чытачоў, якія вымушаны былі адмовіцца ад падпіскі на любімае выданне з-за павялічэння яго кошту. Трыццаці з іх, самым незабяспечаным матэрыяльна, рэдакцыя «Экрана» падарыла гадавую падпіску! А астатніх адразу пачала заахвочваць ілюстраванымі старонкамі, надрукаванымі на добрай паперы, і тым-сім для засяроджанага чытання.

Стваральнікі «Советского экрана» ніколі не хавалі свайго намеру рабіць масавы часопіс. Няма істотных змен у гэтым напрамку і пасля таго, як «Экран» перастаў быць «советским». Перш за ўсё ён стаў больш «замежным»: у першых нумарах 1991 года дзякуючы ў асноўным перакладам артыкулаў з «іхняга» друку. У штаце «Экрана» нават з'явіўся супрацоўнік, які будзе пастаянна гэтым займацца,— В. Баброва. І вось, калі ласка, можна прачытаць пра ўсе хваробы славутай Элізабет Тэйлар ці пра шкадаванне Федэрыка Феліні з нагоды адсутнасці ў Італіі публічных дамоў. Арыентацыя на сярэдняга чытача. Але Феліні ёсць Феліні, меркаванні нават на такую тэму ён наўрад ці задаволіў многіх аматараў «смажанага».

У гэтым ужо праглядваецца пэўная тэндэнцыя. Нягледзячы на захаваную масавасць часопіса, у ім прыбавілася і элітарнасці. Дыялогі журналістаў з папулярнымі акцёрамі сталі больш філасофскімі і аддаліліся ад высвятлення толькі сямейных каранёў і інтымных падрабязнасцей жыцця. Прыкладаў у першых нумарах новага года дастаткова — інтэрв'ю з Алегам Барысавым, з Таццянай Васільевай.

Суседства на старонках думак Яўг. Габрыловіча і рэцэнзіі на кнігу, рубрыка «Аўкцыён меркаванняў», пад якой больш трывала, чым раней, сталі разглядацца новыя фільмы, пацвярджае гэта назіранне: не толькі на масавага чытача разлічаны «Экран». Не забываюцца яго аўтары таксама на аголеных жанчын, на каляровыя развароты з партрэтамі акцёраў і нават на «хваробу» большасці сённяшніх выданняў — успаміны мінулых гадоў з дзеючымі асобамі накшталт Сталіна, Хрушчова, Брэжнева...

Прыбавілася ў «Экране» і настальгічнасці. «Як не хапае ў гэтым свеце кранаючых «паўдурняў» Ліі Ахеджакавай, дзівакаватых халасцякоў Андрэя Мягкова, жыхароў добрага свету Эльдара Разанава»,— напісаў адзін з чытачоў часопіса. Такім вось настроем: «як не хапае сёння...» — прасякнута мноства радкоў, дасланых на аб'яўлены «Экранам» конкурс чытацкіх рэцэнзій «Спроба пяра». Гэта таксама нешта новенькае. Але зноў жа — на працяг былой традыцыі: на першым месцы — сувязь з чытачом, двухбаковая і непарыўная.

ПАЗНАЛІ?

В. ЦІХАНАЎ

А. КАЛЯГІН

Дзякуй, відэасалон!

Эротыка... паміж каментарыямі

Вельмі хочацца прыгажосці. Моцна і безупынна. У паўнюткім транспарце і ў грубых чэргах, на запляваных тратуарах і ў брудных сталоўках...

Адрэкамендавала яго адна знаёмая так: «Без гэтага фільма ў мяне не было б паловы жыцця». Такія словы — добрая нагода для сустрэчы. Але ж дзе? Адзіная магчымасць у выглядзе хатняга відэа ніяк не спраўджваецца.

І вось яна, падзея, дастойная ўвагі ўсяго горада: відэасалон кінатэатра «Победа» прапануе «Дзевяць з паловай тыдняў», фільм амерыканскага рэжысёра Эдрыяна Лайна! Трэба толькі прыйсці за паўгадзіны да адкрыцця касы, каб гарантаваць сабе білет.

Вельмі хочацца прыгажосці...

У відэасалоне ўсяго 10 вялікіх мяккіх крэслаў, значыць, можна застацца амаль што сам-насам з экранам. Там будзе не толькі жаданы фільм, а цэлая праграма пад назвай «Эротыка і грамадства». Яе адкрылі кандыдаты — філасофскіх навук, філалагічных і мастацтвазнаўства. З дапамогай прахожых яны шукалі адказ на пытанне: чым эротыка адрозніваецца ад парнаграфіі. Размова не абышлася без актрысы Алены Якаўлевай. Яно і зразумела — за яе плячыма роля прастытуткі. Алена засведчыла, што «Дзевяць з паловай тыдняў» — лепшая эротыка, якую ёй даводзілася бачыць. Каб у гледачоў была магчымасць параўнання, у праграму ўключылі ўрыўкі з іншых, таксама эратычных стужак.

А потым пачаўся першы з тых дзевяці з паловай тыдняў. Прыгожая жанчына і прыгожы мужчына ў прыгожым дзякуючы ім горадзе. Першы позірк, другая сустрэча... Калі герой і гераіня ўпершыню апынуліся ў пакоі з ложкам, касета раптам спынілася, а потым на экране з'явіўся не вельмі прыгожы мужчына, зноў жа кандыдат навук. Ён старанна растлумачыў недасведчанаму савецкаму гледачу матывы паказаных учынкаў і падрыхтаваў яго да таго, што адбудзецца ў фільме далей.

Вельмі хочацца прыгажосці...

Фільм перапыняўся тым жа філасафам яшчэ тры разы. Але ГЭТА са стужкі ўсё ж не выразалі, паказалі. Праўда, сачыць за экранам проста так было ўжо немагчыма, бо ў галаву настырна лезлі вызначэнні «каментатара»: «сада-мазахізм», «эксгібіцыянізм» і ўпамянутыя ім жа цытаты Маркса.

Тое, што засталося ад «Дзевяці з паловай тыдняў» паміж каментарыямі, быццам складзена з мноства шыкоўных фотаздымкаў, якія хутка змяняюць адзін другі. Аператар карціны аднолькава таленавіты ў нацюрмортах і жывых рухах, партрэтах і пейзажах, буйных планах і агульных. Акцёраў наогул немагчыма ўявіць па-за фабулай гэтага фільма — нездарма ўжо рыхтуецца дзесьці далёка яго працяг.

Але ёсць ва ўсім гэтым нешта надзвычай раздражняючае, і не дапамагае пазбавіцца ад яго ўспамін аб славутых савецкіх рэжысёрах, аператарах, акцёрах. Яны жылі і жывуць сярод нас. Затое мала каму з нашых закаханых ёсць дзе правесці ўдваіх некалькі тыдняў; мала хто з савецкіх мужоў здольны запрасіць былую жонку ў рэстаран; а там яшчэ такая мэбля, такія кватэры і такая садавіна... Дробна ўсё гэта? Напэўна. Але няўжо без усіх дробязей, якіх не хапае нам, можна нармальна жыць? Няўжо матэрыяльнае ніколі не вызначае духоўнае, наадварот, ідзе насуперак яму? Адчайныя пытанні ў пустэчу...

Калі заканчваюцца дзевяць з паловай тыдняў, гераіня дзейнічае амаль па-савецку: пакідае каханага, апантаная страхам стаць рабыняй. Можа таму і асмеліліся паказаць гэты фільм у відэасалоне буйнога кінатэатра? Другая версія: дзякуючы таму ён з'явіўся там, што эротыкі на гэты раз аказалася не больш, чым каментарыяў да яе.

Але — убачылі, узнеслі ся, вярнуліся на свае тратуары... і дзякуй!

Па-ранейшаму хочацца прыгажосці...

Пазнаці?

Ж.-П. БЕЛЬМАНДО

С. СТАЛОНЕ

Прагулка па афішах

Калі Піткін сустрэў Эльвіру

Сёння ў Мінску каля 20 кінатэатраў. Дзейнічаюць таксама відэасалоны, відэазалы і відэакафэ, а яшчэ ёсць кінаэкраны ў палацах культуры. Тым не менш, для амаль што двухмільённага горада гэта відавочна мала. Але парадокс заключаны нават ва ўяўнай спробе павялічыць колькасць мінскіх кіназалаў, бо вынікам будзе не вельмі прывабная перспектыва. Зразумела, у тым выпадку, калі ранейшай застанецца наша кінапракатная палітыка і рэпертуар кінатэатраў.

Між тым, з'ява гэта вельмі цікавая — рэпертуар. Пакуль шукаеш у ім нешта патрэбнае табе, паспееш мімаходзь нацешыцца з аднастайных назваў кінастужак, адзначыць, колькі разоў паўтараюцца адны і тыя ж словы ў розных камбінацыях, пашкадаваць аб добрых і забытых карцінах. І яшчэ адзін незвычайны спадарожнік ёсць у такога занятку: на аснове кінарэпертуара забаўляльную гісторыю можна сачыніць... Дык пачнем. Рухацца будзем уздоўж афіш.

«Эльвіра — уладарка цемры» пачала сваю прагулку па афішах яшчэ ў тыя часы, калі была «Жанчынай дня». Зараз яе чавцей завуць «Дрэнню», а адзін п'яны да непрыстойнасці пан наогул абазваў «Рыжай Соняй». Яна палезла за словам не ў кішэню, а на афішы. І ў адказ п'яніца пачуў пра сябе: «Фуфель», а потым яшчэ мацней: «Робат-паліцэйскі»! «Кінг-Конг»!

Але тут Эльвіра замаўчала, бо раптам грымнуў лямант: «Кінг Конг жывы!», і яна вымушана была стаць саюзніцай п'янага абражальніка — да іх з шалёнай хуткасцю нёсся цэлы натоўп «Вар'ятаў на стадыёне». Страшэнныя рухі суправаджала «Неадстрэленая музыка» і крыкі «Яна з мятлой, ён у чорным капелюшы». За некалькі крокаў да сваіх ахвяр жудасныя сябры «Ніндзі-забойцы» сталі рухацца больш павольна, але па-ранейшаму «Капытам туды, капытам сюды»...

Саюзнік Эльвіры неспадзявана стаў цвярозым і хуценька адрэкамендаваўся ёй: «Піткін». Яна прашаптала: «Здаецца, нас чакае «Кашмар на вуліцы Вязаў». «Не, «Тады я буду абараняцца»,— мужна адказаў Піткін.— Толькі «Дурні паміраюць па пятніцах».

У той жа момант ворагі прад'явілі ім «Ліцэнзію на забойства» і кінуліся на сваіх ахвяр. Але тыя аказаліся «Моцным арэшкам». «Дасягаючы немагчымага», яны пазбавілі сябе і «Кашмару на вуліцы Вязаў», і «Забойства на Манастырскіх сажалках».

Але з таго дня пачаліся «Прыгоды Піткіна ў бальніцы» — ён атрымаў цяжкія раненні ў бойцы. Эльвіра наведвала новага сябра спраўна. Яе «Сатанінская прыгажосць» канчаткова пазбавіла Піткіна спакою. «Ніколі такая жанчына не стане маёй»,— думаў ён доўгімі начамі на бальнічным ложку. Але Эльвіра разгадала яго складаныя думкі і аднойчы сонечным ранкам з'явілася са словамі: «Ніколі не кажы «ніколі»...

Напярадзе ў іх быў «Цяжкі сезон» і «Каханне з прывілеямі», але і шчасце таксама. Калі вы спытаеце ў сённяшняга Піткіна, ці не хацеў бы ён знайсці іншую жанчыну і развесціся з Эльвірай, пачуеце ў адказ: «Разводы... разводы...» Гэта не для нас і не пра нас!»

Кінатэлетайп

СОЧЫ — КІНАСТАЛІЦА

Так-так, папулярны курорт хутка стане месцам правядзення першага Усесаюзнага фестываля «Кінатаўр». Гэта будзе спроба аб'яднаць у рамках адной падзеі і элітарнае, і масавае кіно. На фестывалі пройдуць два конкурсы: першы, «інтэлектуальных» фільмаў, ацэніць прафесійнае журы, а другі, «лёгкіх»,— глядацкае.

І ЯШЧЭ АДЗІН!

Спіс кінафестываляў, якія з'явіліся ў нашай краіне за апошні час, акрамя «Кінатаўра», папоўніцца яшчэ і «Другой прэм'ерай». Яе правядзенне намечана на красавік. Галоўная мэта — дапамагчы савецкаму кінематографу. На першым фестывалі будуць паказаны фільмы, якія з'явіліся за апошнія 2—3 гады ў пракаце. З'явіліся і, быццам, зніклі. Для многіх з іх фестывальны экран стане адзінай магчымасцю яшчэ раз выйці да савецкага гледача.

СПАЗНІЛАСЯ НА 17 ГАДОЎ

прэм'ера фільма Л. Кавані «Начны парцье» ў нашай краіне. Толькі цяпер, пасля дэманстрацыі на фестывалі «Шэдэўры еўрапейскага кіно, невядомыя ў СССР», гэту стужку, ёсць надзея, убачыць не толькі кінакрытыкі, але і звычайныя савецкія гледачы. Пэўна, ніколі не сціхнуць спрэчкі вакол герояў і ідэй «Начнога парцье», бо фільм гэты прысвечаны самаму жудаснаму, што ёсць у свеце,— фашызму і адначасова самаму вечнаму — каханню.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

28 сакавіка

Зак. 2059.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.